**Лёс АЭС вырашыцца**

**За чые грошы збудуюць АЭС?**

**Казулін – кандыдат на ўзнагароду А. Сахарава**

**Турнэ дыктатара Чавэса**

**Першы Берасьцейскі інвэстыцыйны форум**

**“Свабодны тэатар” запачаткаваў міжнародную акцыю дзеячоў культуры**

Прызнаньне вынікаў беларускіх парлямэнцкіх выбараў краінамі ЭЗ, ЗША і міжнароднымі эўрапейскімі інстытутамі расцэньваецца беларускімі ўладамі як самадастатковая каштоўнасьць, якая спрыяе адкрыцьцю новых магчымасьцяў для разьвіцьця краіны, і, адначасова, як сродак ціску на Расею,


photo.bymedia.net

які ўзмацняе перамоўныя пазыцыі краіны ў гандлі з РФ па ўмовах эканамічнага супрацоўніцтва. Апошнім часам, пасьля расейска-грузінскай вайны, беларускі рэжым схільны расцэньваць усталёўваньне трывалых стасункаў з Захадам у якасьці дадатковых гарантыяў сваёй бясьпекі. Пытаньне прызнаньня Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу чацьвертага скліканьня выклікае розную рэакцыю ў дэмакратычным лягеры. Многія палітолягі і бізнэсоўцы лічаць прызнаньне парлямэнту пажаданым, у асяродзьдзі палітыкаў гэтае пытаньне зьяўляецца канфліктным.

ЭЗ і ЗША далі дадатковыя тлумачэньні сваёй пазыцыі па парлямэнцкіх выбарах у Беларусі. Так, Рада міністраў замежных справаў ЭЗ прыняла заяву, у якой гаворыцца, што ЭЗ будзе ацэньваць сытуацыю ў Беларусі ў сьвятле парлямэнцкіх выбараў і прагрэсу ў галіне дэмакратыі і правоў чалавека, пры гэтым ЭЗ гатовы пачаць перагляд абмежавальных мераў супраць беларускіх чыноўнікаў высокага ўзроўню. Заява дакладна

**АНОНС**

**Блёг вядомага беларускага палітоляга Андрэя Ляховіча на інтэрнэт-сайце www.belarus-live.eu**

## Парлямэнцкія выбары ў Беларусі: «прэзыдэнцкі сьпіс»

18 верасьня Лукашэнка заявіў, што зацікаўлены ў тым, каб Захад прызнаў, што выбары адпавядаюць дэмакратычным стандартам. Аднак, як і раней, выбары ў Беларусі праводзяцца ў адпаведнасьці з «прэзыдэнцкім сьпісам».

Улады высунулі асноўных кандыдатаў у дэпутаты і іх дублёраў – «незалежных» кандыдатаў. «Незалежныя» кандыдаты будуць ствараць бачнасьць канкурэнтных выбараў у выпадку зьняцьця кандыдатаў ад апазыцыі.

*Працяг тут http://belarus-live.eu/by/index.php5*

абумоўлівае ўмову пашырэньня супрацоўніцтва – парлямэнцкія выбары павінны быць прызнаныя АБСЭ. Памочнік дзяржсакратара ЗША ў пытаньнях дэмакратыі, правоў чалавека і працы Дэвід Крэмэр, выступаючы ў Вашынгтоне на слуханьнях па сытуацыі ў Беларусі, якія праходзілі ў Камісіі па бясьпецы і супрацоўніцтве ў Эўропе,

заявіў, што выбары ў парлямэнт, якія павінны неўзабаве адбыцца, могуць быць адным з ключавых момантаў у паляпшэньні адносінаў паміж ЗША і Беларусьсю. А часовы паверены Джонатан Мур патлумачыў, што ўлады ЗША абралі беларускія кампаніі ААТ «Лакафарба» і ААТ «Полацак-Шкловалакно», санкцыі супраць якіх былі прыпыненыя ў верасьні, са сьпісу, дадзенага беларускім бокам. Дыплямат таксама адзначыў, што прычына прыпыненьня санкцыяў супраць дзьвюх кампаніяў Беларусі ў тым, што ЗША хацелі зрабіць канкрэтны крок у адказ на вызваленьне ўладамі палітзьняволеных у жніўні.

«Далейшыя крокі амэрыканскага боку будуць грунтавацца на разьвіцьці сытуацыі з правамі чалавека ў Беларусі», – дадаў дыплямат. Ён таксама адзначыў, што «пры ідэальным разьвіцьці падзеяў» паляпшэньне адносінаў Беларусі з ЗША магло бы стаць грунтам для значнай падтрымкі з боку ЗША.

«Мы маглі б аказаць падтрымку ў галіне прыцягненьня інвэстыцыяў з ЗША, маглі бы падтрымаць Беларусь у ейным уступленьні ў Сусьветную гандлёвую арганізацыю, маглі бы быць заключаныя двухбаковыя пагадненьні ў галіне




разьвіцьця ядзернай энергэтыкі. Магчымае супрацоўніцтва і ў іншых галінах без абмежаваньняў», – зазначыў Джонатан Мур.

У сваю чаргу Аляксандар Лукашэнка ў інтэрвію брітанскай газэце «Файнэншл Таймс» і нямецкаму выданьню «Франкфуртэр Альгемайнэ Цайтунг» заявіў, што Беларусь жадае, каб Захад прызнаў парлямэнцкія выбары ў Беларусі.

«Наша замежная палітыка ня можа быць іншай – гэта прадыктавана самім геаграфічным становішчам краіны, – заявіў Аляксандар Лукашэнка. – Бо, як вядома, мы ня толькі неад'емная частка Эўропы, але й яе геаграфічны цэнтар».

Закранаючы тэму парлямэнцкіх выбараў, Аляксандар Лукашэнка падкрэсьліў, што ідзе на парушэньне беларускіх законаў, каб выбары адпавядалі нормам ЭЗ. Аднак ён перасьцярог, што ЭЗ і ЗША пасьля выбараў павінны быць аб'ектыўныя ў адзнаках, абвінавачваючы Захад у «падвойных стандартах». Ён наракае, што вялікія краіны з падобнымі палітычнымі недахопамі пазьбягаюць пакараньня – асабліва гэта датычыцца Расеі.

«Падабаецца гэта Захаду ці не падабаецца, але парлямэнт будзе абраны ў адпаведнасьці з нашай канстытуцыяй, – кажа ён. – Я ня буду вымольваць сабе візы ЭЗ».

Лукашэнка лічыць, што выклікаў раздражненьне ў Расеі, не прызнаўшы Паўднёвую Асэтыю і Абхазію. Але ён не выключае, што паступіць так у будучыні, – паводле ягоных словаў, новы парлямэнт павінен выказаць сваю думку. Ён адзначае як «абсалютна бязглузды» тэзіс, што дзеяньні Расеі стварылі небясьпечны прэцэдэнт для Беларусі. «Божа барані нас, калі Расея паспрабуе зрабіць тое ж самае зь Беларусьсю. У гэтым няўяўным выпадку ў Эўропы будзе поўнае права запрацівіцца Расеі, не ідучы на кампраміс у дачыненьні да якіх-колечы мэтадаў ці рычагоў», – заявіў Лукашэнка.

Лукашэнка хоча, каб Захад актыўней удзельнічаў у жыцьці краінаў на тэрыторыі былога СССР. Паводле ягоных словаў, уплыў Захаду – асноўная прычына, якая прымусіла былыя рэспублікі СССР не прытрымлівацца прыкладу Расеі і ўстрымацца ад прызнаньня Абхазіі і Паўднёвай Асэтыі. Але дзе гарантыі таго, што ў будучыні Захад застанецца дастаткова моцнай супрацьвагай «для няўхільна ўзрастальнае сілы Расеі і ўзрастальнага ўплыву Расеі ў гэтых краінах»?

Днём пазьней, у Воршы, Аляксандар Лукашэнка зноўку выказаў сваё меркаваньне наконт праблемаў узаемаадносінаў з ЭЗ. Ён заявіў, што «спыніць усялякія размовы», калі Захад назаве недэмакратычнымі парлямэнцкія выбары, што пройдуць 28 верасьня. «Гэтыя выбары ўжо так арганізаваныя, як ніколі», – заявіў Лукашэнка. Он выказаў упэўненасьць, што насельніцтва рэспублікі ня будзе галасаваць за апазыцыйных кандыдатаў, бо «ўсе яны – беспрацоўныя». «Як ён можа перамагчы, як за беспрацоўнага могуць галасаваць людзі?» – зазначыў Лукашэнка.

«Таму ня трэба думаць, што апазыцыя тут ірване моцна. Можа быць, і добра было б, калі б нехта зь іх перамог...» – выказаў сваё меркаваньне Лукашэнка.

Яшчэ адным этапам выбараў лічыцца рэгістрацыя Цэнтральнай камісіяй па выбарах і правядзеньні рэспубліканскіх рэфэрэндумаў 55 кандыдатаў у чальцы Савету Рэспублікі (верхняя палата) Нацыянальнага сходу Беларусі.

У ліку кандыдатаў — сьпікер верхняй палаты Генадзь Навіцкі, старшыня Палаты прадстаўнікоў Вадзім Папоў, старшыня праўленьня «Беларусбанку» Надзея Ермакова, былы амбасадар у Канадзе Ніна Мазай, намесьнік дырэктара Інстытуту дзяржаўнай службы Антаніна Морава, першы намесьнік кіраўніка Адміністрацыі прэзыдэнта Анатоль Рубінаў, намесьнік старшыні Вышэйшага гаспадарчага суду Яўген Сьмірноў, генэральны дырэктар СТАА «Марка» Мікалай Мартынаў ды іншыя. Першапачаткова пляналася зарэгістраваць 56 чалавек, але пратаерэй Фёдар Поўны адмовіўся высоўвацца ад Менску. Як паведаміў на паседжаньні Цэнтарвыбаркаму яго сакратар Мікалай Лазавік, айцец Фёдар не атрымаў дабраславеньне патрыярха Маскоўскага і ўсёй Русі Алексія II на ўдзел у выбарах.

Савет Рэспублікі фармуецца ў складзе 64 чалавек: па восем ад кожнай вобласьці і Менску, яшчэ восем прызначае прэзыдэнт. Такім чынам, выбары ў Савет Рэспублікі адбудуцца на безальтэрнатывнай аснове. У гэтым органе павінен зьявіцца 41 новы член.

Выбары чальцов Савету Рэспублікі будуць праходзіць з 21 верасьня па 10 кастрычніка на паседжаньнях дэпутатаў мясцовых Саветаў дэпутатаў базавага ўзроўню ў кожнай вобласьці і дэпутатаў Менскага гарадзкога Савету дэпутатаў.




А тым часам, за тыдзень да афіцыйнай даты выбараў на выбарчых участках сталі галасаваць датэрмінова. І пачаліся расейска-беларускія вайсковыя вучэньні. Мяркуецца, што ў небе Беларусі павінны зьявіцца расейскія вайсковыя самалёты. І амаль адразу пасьля выбараў, 5 кастрычніка ў Менск прыедзе Ўладзімер Пуцін. Мэтай візыту, як афіцыйна заяўлена, зьяўляецца абмеркаваньне «знакавых пытаньняў».

АФІЦЫЙНА

## Лёс АЭС вырашыцца

***Будзе абраная пляцоўка для будовы беларускай АЭС. У Міністэрстве энэргетыкі на паседжаньні, прысьвечаным менавіта гэтай праблеме, будзе прынятае канчатковае рашэньне.***

Пад увагу бяруцца тры пляцоўкі – Астравецкая, Краснапалянская й Кукшынаўская. Паводле беларускіх уладаў, ніводная зь іх ня мае супрацьпаказаньняў для пабудовы атамнай электрастанцыі.

ГРАМАДЗТВА

## За чые грошы збудуюць АЭС?

***Амаль палова насельніцтва Беларусі гатовая ўкласьці свае грошы ў фінансаваньне будаўніцтва АЭС – паведаміў Міхал Хурс зь Інстытуту сацыялёгіі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі.***

49% рэспандэнтаў згадзілася б у той ці іншай меры прыняць удзел у фінансаваньні АЭС – заявіў Хурс, спасылаючыся на вынікі рэспубліканскага сацыялягічнага апытаньня, праведзенага ў пэрыяд ад сьнежня 2007 да лютага 2008 году. У апытаньні прыняло ўдзел 2011 рэспандэнтаў з усіх рэгіёнаў краіны.

Сацыёляг адзначыў, што яшчэ больш за палову – 51% – не пагадзіліся ўдзельнічаць у фінансаваньні. Хурс лічыць гэты вынік



photo.bymedia.net

станоўчым, паколькі інтэрпрэтуе яго як вялікія рэзэрвы для павелічэньня колькасьці тых, хто пагодзіцца ўдзельнічаць у народным будаўніцтве АЭС. Гэта можа адбыцца ў выніку росту інфармаванасьці насельніцтва пра выгоды будаўніцтва АЭС і ўдзел у яе фінансаваньні.

*Паводле www.newsdate.by*

АПАЗЫЦЫЯ

## Казулін – кандыдат на ўзнагароду А. Сахарава

***Экс-кандыдат у прэзыдэнты, былы палітвязень Аляксандар Казулін уваш оў у лік кандыдатаў на прэмію Эўрапейскага парлямэнту „За свабоду думкі” імя Андрэя Сахарава.***

Другім кандыдатам зьяўляецца кітайскі праваабаронца Ху Джыа,


photo.bymedia.net

якi ў дадзены момант знаходзіцца ў зьняволеньні, трэці кандыдат – гэта старшыня незалежнай выбарчай камісіі Дэмакратычнай Рэспублікі Конга Эбот Апалінарый Малу Малу.

Ляўрэат прэміі Сахарава стане вядомы ў сярэдзіне кастрычніка, а ўручэньне ўзнагароды адбудзецца 17 сьнежня.

Эўрапейскі парлямэнт уручае прэмію з 1988 году. Гэта грашовая ўзнагарода памерам 50 тысяч эўра.

Прадстаўнікі Беларусі двойчы атрымлівалі ўзнагароду Эўрапарлямэнту: у 2004 годзе – Беларуская асацыяцыя журналістаў, у 2006 годзе – Аляксандар Мілінкевіч.

ПАЛІТЫКА

## Турнэ дыктатара Чавэса

***Прэзыдэнт Вэнэсуэлы Ўга Чавэс плянуе наведаць Беларусь й Расею пасьля афіцыйнага візыту ў Кітай.***

Падчас візыту ў Кітай вэнэсуэльскі прэзыдэнт правядзе перамовы са сваім калегам Ху Цзіньтао, а таксама іншымі прадстаўнікамі кітайскіх


photo.bymedia.net

улад ды найважнейшымі бізнэсоўцамі. Пасьля Пэкіну Ўга Чавэс наведае Расею й Беларусь, а потым накіруецца ў Францыю й Партугалію.

ЭКАНОМІКА

## Першы Берасьцейскі інвэстыцыйны форум

***Першы Берасьцейскі інвэстыцыйны форум прыняў 150 удзельнікаў дзелавых колаў і дыпляматычных прадстаўніцтваў з 16 краінаў. Падобнае мерапрыемства ў Берасьці праводзілася ўпершыню.***

Менавіта па гэтай прычыне кантракт на 500 млн. эўра кампаніі “БелЭнэргія” зь італьянскім капіталам параўноўваць пакуль няма з чым. Тым ня менш менавіта яна плянуе прывезьці й замантаваць новае абсталяваньне на прыродным газе.

Падчас працы форуму адбыўся аўкцыён па продажы камунальнай маёмасьці. Праўда, не на ўсе аб’екты, што былі выстаўленыя на продаж, знайшліся ахвотныя. Тым ня менш удалося прадаць, напрыклад, будынак былога штабу ў вайсковым гарадку Кобрыня й сталоўку ў Камянцы.

Аднак пытаньні, якія адносяцца да павялічэньня заахвочваньня замежных інвэстараў на тэрыторыю рэгіёна застаюцца. Берасьцейская тэрытарыяльная фундацыя дзяржаўнай маёмасьці заключыла некалькі пагадненьняў з кансалтынгавымі кампаніямі на конт садзейнічаньня ў пошуках пакупнікоў. Больш за тое, магчымасьці Берасьцейшчыны ў галіне рэалізацыі інвэстыцыйных праектаў плянуецца прадэманстраваць у лістападзе бягучага года ў Лёндане падчас правядзеньня Першага беларускага інвэстыцыйнага форуму.

КУЛЬТУРА

# “Свабодны тэатар” запачаткаваў міжнародную акцыю дзеячоў культуры

***Беларускія артысты запачаткавалі міжнародную акцыю дзеячоў культуры ў падтрымку канвэнцыі ААН супраць гвалтоўных зьнікненьняў.***

У Ратэрдаме ў рамках міжнароднага тэатральнага фэстывалю “Rotterdamse Schouwburg” “Свабодны тэатар” паказаў спэктакль “Спасьцігаючы любоў” пра загінулых у Беларусі вядомых людзей.

Асновай п’есы стала гісторыя каханьня й гісторыя сям’і Красоўскіх. Адмыслова на гэты паказ у Ратэрдам прыляцела Ірына Красоўская.

Пяршымі да акцыі ў падтрымку канвэнцыі ААН супраць гвалтоўных зьнікненьняў далучыліся брытанскія дзеячы культуры, якія адмыслова для спэктаклю запісалі два трэкі, дзе пад музыку начытваюць фрагмэнты тэксту канвэнцыі супраць гвалтоўных зьнікненьняў.

*Паводле www.charter97.org*

CENTRUM STOSUNKÓW MIĘDZYNARODOWYCH
CENTER FOR INTERNATIONAL RELATIONS

БЕЛАРУСКАЯ АСАЦЫЯЦЫЯ ЖУРНАЛІСТАЎ

EUROPEAN RADIO FOR BELARUS

polska pomoc

There are various sites devoted to events in Belarus, which are, however, little known in Western Europe, and among people dealing with politics towards Belarus who do not understand the Russian or Belarusian languages.

The site belarus-live fills this gap. The site allows to order weekly reception of news in English, Polish, Belarusian, Russian.